# АБДУМВАЮЧЫ ПЛАНЫ СЯМІГОДКІ...

У тэзісах даклада М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС прадугледжваецца далейшае ўсебаковае эканамічнае і культурнае развіццё Беларускай ССР. Аб'ём капітальных укладанняў у народную гаспадарку нашай рэспублікі, як вядома, складзе 32 мільярды рублёў. Гэта ў два з лішнім разы больш, чым за мінулыя сем год. Пры гэтым валавая прадукцыя прамысловасці к канцу сямігодкі ўзрасце на 80 працэнтаў. Асабліва хуткімі тэмпамі будуць развівацца паліўна-энергетычная, хімічная, машынабудаўнічая прамысловасць і вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. У вялікіх памерах вырасце прамысловая перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны. Паспяховае выкананне намечаных сямігадовым планам мерапрыемстваў патрабуе максімальнай мабілізацыі прыродных і вытворчых рэсурсаў, а таксама вырашэння раду праблем тэрытарыяльнага размяшчэння прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Усё гэта не толькі адкрывае шырокія магчымасці перад выкладчыкамі ўніверсітэта, у прыватнасці географамі і эканамістамі, для творчай навукова-даследчай дзейнасці, але і ўскладае на нас вялікую адказнасць.

Многія навуковыя работнікі геаграфічнага факультэта заняты вырашэннем важных праблем, звязаных з развіццём прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі. На кафедры фізічнай геаграфіі працягваюцца работы па фізіка- геаграфічнаму раяніраванню. Члены кафедры эканамічнай геаграфіі займаюцца вывучэннем размяшчэння гаспадаркі Палесся. Да гэтых работ прыцягнута частка студэнтаў старэйшых курсаў.

У прадстаячай сямігодцы кафедрамі факультэта намячаецца вывучэнне геаграфіі насельніцтва рэспублікі. Праведзены цяпер перапіс насельніцтва дасць для распрацоўкі гэтай тэмы багацейшы матэрыял, асабліва для выяўлення шляхоў больш эфектыўнага выкарыстання ў народнай гаспадарцы працоўных рэсурсаў.

Вялікія задачы стаяць перад калектывам факультэта па напісанню вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў завочнага і вячэрняга аддзяленняў.

У 1959—1960 гг. будуць падрыхтаваны да друку вучэбныя дапаможнікі па гісторыі і геаграфіі Беларусі, зборнікі практычных работ па геадэзіі, картаграфіі і эканамічнай геаграфіі. У наступныя два-тры гады намячаецца напісаць вучэбныя дапаможнікі па фізічнай геаграфіі частак свету. Будуць выдадзены лекцыі па чатырох курсах у дапамогу самастойнай рабоце студэнтаў.

Рыхтуючыся да XXI з'езду КПСС, супрацоўнікі і студэнты геаграфічнага факультэта дзейна абмяркоўваюць усе гэтыя пытанні.

**І. ТРУХАН,**
**кандыдат геаграфічных навук.**

☆

Пасля заканчэння ўніверсітэта студэнтаў геаграфічнага факультэта накіроўваюць працаваць настаўнікамі, а таксама ў экспедыцыі.

Нам будучым настаўнікам, вельмі мала даюць практыкі,—усяго адзін месяц, і кароткі курс педагогікі. Гэтага недастаткова.

На нашу думку, педпрактыку неабходна праводзіць на працягу 5—8 месяцаў. Пры гэтым трэба ўсе-такі сур'ёзна падумаць над пытаннем аб'яднання геафакаў БДУ і педінстытута.

Як будучыя навуковыя супрацоўнікі і даследчыкі мы, аднак, не спецыялізуемся ў пэўным напрамку. Мы вывучаем шмат агульных геаграфічных дысцыплін. Але глыбокіх ведаў па якой-небудзь адной дысцыпліне не маем. Таму пасля заканчэння ўніверсітэта мы не можам сказаць, што сярод нас ёсць дастаткова падрыхтаваныя глебазнаўцы ці геабатанікі, геаметролі ці геолагі. Таму вельмі важна, каб кожны студэнт адразу ж ведаў, дзе ён будзе працаваць: у школе ці экспедыцыі—і па якой спецыяльнасці канкрэтна.

Для геаграфіі сучаснай эпохі характэрна тое, што яна перастае быць навучальнай, апісальнай навукай. Сучасныя метады даследаванняў характарызуюцца сваім матэматычным абгрунтаваннем. У сувязі з гэтым мэтазгодна, каб для нас увялі курс вышэйшай матэматыкі, геафізікі і геахіміі.

Географ-даследчык—гэта перш за ўсё палявік. Таму трэба больш і лепш праводзіць работы ў палявых умовах, у складзе экспедыцый, геалагічных партый. Зараз у Беларусі працуе вельмі многа экспедыцый па вывучэнню Палесся і па пошуках нафты. Было б вельмі добра, каб нас знаёмілі з гэтай справай.

Неабходна таксама больш праводзіць практычных заняткаў у лабараторыях. Студэнты павінны самі ўмець паставіць ўсялякія вопыты: аналіз глебы, хімічны аналіз вады і іншыя. З гэтай мэтай трэба даць больш часу для заняткаў у лабараторыях.

Важна, безумоўна, для студэнтаў-географаў удзельнічаць у секцыі турызма-альпінізма, экспедыцыях, паездках па Савецкаму Саюзу і замежных краінах. У гэтым сэнсе і прафком універсітэта павінен аказаць геаграфічнаму факультэту адпаведную дапамогу.

Улічваючы той факт, што ёсць шмат нявырашаных пытанняў па падрыхтоўцы географаў, неабходна правесці сумесна са студэнтамі і выкладчыкамі дэталёвае абмеркаванне гэтых праблем.

**В. СКРАБОЎСКІ,**
**З. БАРЫЛА.**



**Закончыліся практычныя заняткі па фізічнай хіміі ў студэнтаў IV курса хімічнага факультэта. Выдатна справілася з лабараторнымі заданнямі Ала Крылова. Ала ўмела спалучае добрую вучобу з грамадскай работай. Яна чулы добры таварыш.**

## Народ вітае сваё будучае

Праз тры дні пачне сваю работу XXI з'езд КПСС. Яго рашэнні з'явяцца разгорнутай праграмай барацьбы за вырашэнне асноўнай эканамічнай задачы СССР, праграмай росту грамадскага багацця і далейшага ўздыму матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню савецкага народа.

Аб'ём дзяржаўных капітальных укладанняў у прадстаячай сямігодцы дасягне вялікай сумы—прыкладна 1 трыльёна 970 мільярдаў рублёў.

У Беларусі прадугледжваецца стварэнне нафтапераапрацоўчай і хімічнай прамысловасці, далейшае развіццё машынабудавання, лёгкай і харчовай прамысловасці, значнае палепшанне паліва-энергетычнай базы. На развіццё гаспадаркі рэспублікі выдаткоўваецца прыкладна 32 мільярды рублёў.

Сельская гаспадарка рэспублікі і ў далейшым будзе спецыялізавацца ў кірунку малочнай жывёлагадоўлі, мясной свінагадоўлі, развядзення вадаплаваючай птушкі, вытворчасці бульбы, ільнудаўгунцу.

Гэта велічная праграма, якая вядзе да багацця прадметаў спажывання. Яна з'яўляецца яркім доказам клопатаў партыі і ўрада аб дабрабыце народа. Наш савецкі народ горача вітае грандыёзныя планы сямігодкі.

**М. ЯРАВІКОЎ,**
**заг. кабінетам палітэканоміі.**

# ІНІЦЫЯТЫЎНА, З ЖЫВІНКАЙ

Надыходзячы XXI з'езд партыі, які абмяркуе «Кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады», паставіць перад савецкім народам велічныя задачы ў барацьбе за пабудову камуністычнага грамадства. І ў гэтай барацьбе важную ролю адыграе рух пад лозунгам: «Лепшае ад кожнага—калектыву, лепшае ад калектыва—кожнаму!».

Камсамольскае бюро фізічнага факультэта лічыцца адным з лепшых. Хочацца паглядзець, чым яно заваявала сабе гэтую славу. Камсамольскае бюро фізфака—гэта баявы орган у вырашэнні важнейшых задач факультэта: павышэння паспяховасці, дысцыпліны, выхавання ўсебакова развітага чалавека.

Значную работу вядзе СНТ факультэта. Было прачытана пяць навуковых дакладаў на канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю БССР. Зараз студэнты працуюць над навуковымі работамі для наступных канферэнцый і агляду. Са сваімі дакладамі некаторыя з іх выедуць у Каўнас.

Галоўнае—вучоба. Многа часу патрэбна, каб добра вучыцца. Але гэта не перашкаджае камсамольцам уважліва сачыць за ўсім новым у краіне і за мяжой. На ўсіх курсах актыўна абмяркоўваюцца рашэнні пленумаў ЦК КПСС і іншыя надзённыя пытанні бягучай палітыкі. Актыўна ўдзельнічалі камсамольцы ў нядзельніках. На сходах абмяркоўвалася пытанне аб удзеле камсамольцаў у фізічнай працы. Дасталася «ў косці» гультаям. Камсамольцы асудзілі тых, хто ўхіляўся ад работы, вынеслі строгія вымовы Івашкевіч, Караулавай, Гары і інш.

Адлюстроўваць факультэцкае жыццё дапамагае насценны друк. У фізікаў выходзіць газета «За навуку» з цікавым дадаткам «Пылясос». Дастаецца нядбайнікам і ад курсавых газет: «Асы», «Пілюлі» і інтэрнацкай «Мятлы».

Цікава праводзяць студэнты і адпачынак. Цесная сувязь устаноўлена з воінамі; арганізоўваюцца сумесныя вечары, на якіх выступаюць з мастацкай самадзейнасцю і воіны, і студэнты. Змястоўны даклад аб 40-годдзі БССР прачытала для воінаў студэнтка IV курса Г. Палешукова. Група былых ваеннаслужачых, зараз студэнтаў, пабывала ў гасцях у воінаў, расказала ім аб сваіх справах, аб вучобе ў БДУ.

Спартсмены праводзяць спаборніцтвы па шашках, па баскетболу з тэхнічным вучылішчам, наладжваюць лыжныя вылазкі. Аматары музыкі па чацверах збіраюцца ў інтэрнаце на музычны лекторый. Іншыя ж адаюць перавагу спартыўным секцыям, гурткам. Студэнты наведваюць стралковы, парашутны, аўтамабільны і іншыя гурткі.

А вечарамі, калі запальваюцца рознакаляровыя агні, на вуліцах Мінска можна сустрэць строгую кампанію фізікаў—гэта камсамольскі патруль.

Ініцыятыўна, з жывінкай працуе камсамольскае бюро фізічнага факультэта.

**Р. КАЗАКЕВІЧ.**
**Н. ЗАГОРСКАЯ.**

## *На парадку дня—сесія*

Ажыўлена праходзяць у нас семінары і практычныя заняткі. Грунтоўныя адказы студэнтаў, веданне імі матэрыялу сведчыць аб добрай падрыхтоўцы да сесіі. Да ліку актыўных студэнтаў трэба аднесці Л. Іодка, Т. Болдзіну, Л. Вашкевіч.

Уменне рацыянальна размеркаваць свой час дае магчымасць студэнтам займацца грамадскай работай і культурна, цікава адпачываць. Цяжка знайсці на курсе чалавека, які б не рабіў што-небудзь для факультэта, для БДУ. Галя Кулікова, Тома Жывета дапамагаюць моладзі аўтазавода рыхтавацца да паступлення ў ВНУ. Галя Бахар і Таня Нікіфарэнка вядуць геаграфічны гурток у падшэфным дзіцячым доме № 6. У 50-й школе г. Мінска 8 студэнтаў працуюць важатымі. Нядаўна цікава і ажыўлена прайшоў вечар сустрэчы з першакурснікамі на тэму «Успомнім першае студэнцкае лета», дзе мы маляўніча і некалькі павучальна расказалі сваім малодшым таварышам аб самым цікавым, што было ў нас—летняй практыкі.

Зараз бюро рыхтуе дыспут па кнізе Анатоля Кузняцова «Працяг легенды».

Вялікія планы ў камсамольцаў курса, але самае важнае на парадку дня зараз—паспяхова здаць сесію.

**Т. ЗЛОТНІКАВА,**
**камсорг II курса геафака.**



**Першыя і пятыя курсы ўжо здаюць апошнія экзамены, а на другіх яшчэ ідуць апошнія заняткі.**
**НА ЗДЫМКУ: студэнты IV курса фізічнага факультэта на лабараторных занятках па электра фізіцы.**

**Фота М. ШОБЫ.**

# МЯСЦКОМ СЛАБА ПЕРАБУДОЎВАЕ РАБОТУ

◆

**Са справаздачнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу і супрацоўнікаў універсітэта**

◆

Адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя прафсаюзнай арганізацыі прафесарска-выкладчыцкага складу і супрацоўнікаў універсітэта.

Са справаздачным дакладам выступіў старшыня мясцкома І. В. Зазека.

— За справаздачны перыяд, — сказаў ён,—мясцовы камітэт імкнуўся падпарадкаваць усю работу прафсаюзнай арганізацыі тым задачам, што паўсталі перад калектывам БДУ ў сувязі з рашэннямі партыі і ўрада аб паляпшэнні вышэйшай школы.

Профбюро юрыдычнага факультэта многа ўвагі аддавала вытворчым пытанням, звязаным з паляпшэннем вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы. Тут былі праведзены нарады аб паляпшэнні арганізацыі вучэбнага працэсу на завочным аддзяленні, аб правільным размеркаванні вучэбнай нагрузкі паміж выкладчыкамі, аб рабоце вучэбных кабінетаў і г. д.

На прафсаюзным сходзе філалагічнага факультэта рэзка крытыкавалася кафедра педагогікі за дрэннае правядзенне педагагічнай практыкі на IV курсах.

Далей дакладчык спыніўся на дзейнасці камісій мясцкома.

Вытворчая камісія прымала ўдзел у распрацоўцы перспектыўных планаў навукова-даследчай работы, правяла праверку загружанасці лабарантаў і ўмоў іх работы.

Ёсць недахопы ў выкарыстанні зацверджаных штатаў. Так, на пасадзе вучонага сакратара лічылася Н. П. Якушава, якая атрымлівала гэтую стаўку, а вучоны сакратар М. А. Урылева атрымлівала стаўку лабаранта кабінета друку. На пасадзе інжынера па будаўніцтву працуе Гіляровіч і атрымлівае поўную стаўку. Аднак ён з'яўляецца работнікам архітэктурнага ўпраўлення Мінскага горсавета і не мае дазволу на сумяшчальніцтва.

Некаторыя прафесары, загадчыкі кафедрамі ўхіляюцца ад чытання лекцыйных курсаў, перакладаюць гэту работу на дацэнтаў, старшых выкладчыкаў, а калі-небудзь і на аспірантаў. В. І. Сцяпанаў, Г. М. Міхайлаў, Ф. Г. Асіпенка і некаторыя другія не выконваюць прадугледжаную планам вучэбную нагрузку. Гэта прывяло да таго, што для чытання іх жа курсаў запрашаюцца пазаштатныя работнікі.

Пачаліся спрэчкі. Я. Карабутава адзначыла, што аддзел кадраў падбірае на работу людзей, не ўзгадніўшы гэтае пытанне з прафсаюзнымі арганізацыямі.

Сакратар парткома С. Я. Янчанка ў сваім выступленні адзначыў, што мясцком слаба перабудоўвае сваю работу ў святле ўказанняў снежаньскага Пленума ЦК КПСС, мала займаецца вытворчай работай, не заслухоўвае справаздач кафедраў.

Слаба арганізавана праверка выканання рашэнняў мясцкома.

Прафсаюзны сход прызнаў работу мясцкома здавальняючай. У прынятай рэзалюцыі намечан рад мерапрыемстваў па ліквідацыі недахопаў і паляпшэнню работы новага складу мясцкома.

☆ ☆ ☆

**Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага складу мясцовага камітэта, выбранага на агульнаўніверсітэцкай канферэнцыі.**

**Абавязкі паміж членамі мясцкома размеркаваны наступным чынам:**

**Міхайлаў А. М.—старшыня мясцкома і старшыня камісіі сацыяльнага страхавання; Дзяменцьеў В. А.—намеснік старшыні па вытворчай рабоце; Хрыпко Н. П.—намеснік старшыні па культурна-масавай і бытавой рабоце і старшыня культурна-масавай камісіі; Быстрык Ф. Л.—казначэй; Некрашэвіч І. Г.—старшыня камісіі па вытворчай рабоце і зарплаце Чыгір В. Ф.—старшыня жыллёва-бытавой камісіі, Конюшка І. М.—старшыня камісіі па ахове працы.**

